## ПЕРШЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАНАЛ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ НА НОВЫМ ЭТАПЕ РАЗВІЦЦЯ

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё – найбуйнейшы радыёканал краіны. Доўгія гады ён застаецца адной з галоўных крыніц грамадска-палітычнай інфармацыі ў медыяпрасторы Беларусі. У аснове вяшчальных прыярытэтаў канала – аператыўнасць, масавасць, даступнасць.

Як сведчаць вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2008 годзе, канал стабільна захоўвае высокія рэйтынгавыя пазіцыі – у рэспубліцы яго доля складае каля 30 %, што значна перавышае паказчыкі іншых радыёстанцый.

Істотныя змяненні ў рабоце канала адбыліся ў верасні 2008 года з пачаткам новага вяшчальнага сезона. Сетка вяшчання абнавілася на 60 %. У выніку творчага конкурсу ў эфіры з'явіліся новыя цікавыя праекты. Былі ўдасканалены перадачы, якія ўжо заваявалі сваіх пастаянных слухачоў.

Галоўнай адметнасцю сезона 2008–2009 гг. з'яўляецца фарматаванне вяшчання. З улікам нацыянальнага статусу, грамадскага значэння і сацыяльных функцый вызначаны фармат канала «General programme» («Грамадскае радыё»), заснаваны на спалучэнні інфармацыйных, тэматычных і музычных перадач, арыентаваных на слухачоў розных сацыяльных груп і ўзроставых катэгорый.

Аснову вяшчання фарміруюць інфармацыйныя і аналітычныя перадачы. Галоўныя падзеі ў палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным і спартыўным жыцці краіны і свету – пастаянна ў цэнтры ўвагі рэпарцёраў службы інфармацыі. Аператыўнае асвятленне дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, заканадаўчай, выканаўчай і судовай галін улады забяспечваюецца ў інфармацыйных выпусках і праграмах «Радыёфакт», «Пастфактум», «Падзеі: факты і каментарыі».

На канале праводзяцца прамыя радыётрансляцыі важных грамадска-палітычных падзей з удзелам вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы – пасланняў Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту, урачыстых мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці, фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі», Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар».

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне на канале створаны тэматычныя перадачы з удзелам ветэранаў, моладзі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

Пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі аналізуюцца ў тэматычных перадачах «Дыялог», «Палітыка», «Акцэнты», «Беларускі шлях», у аналітычных праграмах «Беларусь і свет», «Палітычны вектар», «Беларусь – Расія: грані станаўлення Саюзнай дзяржавы».

На працягу дня гучаць палітычныя каментарыі, эканамічныя навіны, агляды беларускай і замежнай прэсы. Канал мае шырокую сетку ўласных

карэспандэнтаў у рэгіёнах краіны і за мяжой. Геаграфія прамых рэпартажаў – Расія, Украіна, Польшча, Латвія, Эстонія, Малдова, Арменія, Азербайджан.

Канал практыкуе рэгулярнае правядзенне міждзяржаўных радыёмастоў, развівае супрацоўніцтва з радыёкампаніямі дзяржаў СНД, Еўрасаюза, членамі Еврапейскага і Азіяцкага вяшчальных саюзаў, Радыё ААН і іншымі.

Як паказвае практыка, у сучаснай радыёаўдыторыі вялікай папулярнасцю карыстаюцца праекты, заснаваныя на SMS-сэрвісах і тэлефанаваннях. У сувязі з гэтым у новым сезоне на канале была значна павялічана колькасць інтэрактыўных праектаў.

Сярод новых перадач – «Грамадская прыёмная» (аналітычная праграма аб рабоце са зваротамі грамадзян), «Улада народа» (грамадска-палітычная перадача аб дзейнасці органаў заканадаўчай улады), «Юрыдычная кансультацыя» (прававая праграма), «Інтэлектуальны марафон» (радыёвіктарына), «Добры дзень!» (інфармацыйна-музычная перадача), «СМС-эфір» (інтэрактыўны праект па заяўках), «Кароткія гісторыі» (штодзённы вячэрні радыёсерыял), «Радыёла» (музычна-пазнавальная праграма, прысвечаная музыцы 60–80-х гадоў), тэматычныя музычныя праграмы «Мелодыі дзяцінства», «Накцюрн», «Рэтра-канцэрт», «У свеце электроннай музыкі» і іншыя.

У рамках вядомай грамадска-палітычнай праграмы «Актуальны мікрафон» ладзяцца сумесныя з друкаванымі выданнямі і інфармацыйнымі агенцтвамі «прамыя лініі».

У папулярнай маладзёжнай перадачы «Адкрытая пляцоўка» з’явіліся новыя рубрыкі, прысвечаныя пытанням прафесійнай арыентацыі юнакоў і дзяўчат, дзяржаўнай падтрымкі адоранай моладзі, прафілактыкі ў маладзёжным асяроддзі наркаманіі, п’янства і алкагалізму.

Музычная палітыка канала, як і раней, заснавана на папулярызацыі творчасці беларускіх аўтараў і выканаўцаў.

Варта адзначыць, што Першы нацыянальны канал Беларускага радыё пастаянна становіцца пераможцам Нацыянальнага конкурсу «Брэнд года» ў спажывецкай намінацыі.

Быць заўжды цікавым для сваіх слухачоў, разам абмяркоўваць актуальныя пытанні, прыемна і з карысцю адпачываць – усё гэта адлюстроўваецца ў слогане самага папулярнага радыёканала Беларусі «Будзем разам!».